# ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ—ФІНІШАВАЎ!



У трэцім працоўным семестры сёлетняга года ўдзельнічала 650 байцоў у саставе 26 будаўнічых атрадаў нашага ўніверсітэта. Яны ўнеслі дастойны ўклад у агульнанародную справу — датэрміновае выкананне заданняў трэцяга, рашаючага года дзевятай пяцігодкі.

З сённяшняга нумара газеты мы пачынаем расказваць аб працоўных буднях універсітэцкіх будаўнічых атрадаў, аб іх здзяйсненнях і карысных справах.



**Злева — камсамольскія пуцёўкі атрымалі байцы атрада «Універсал-73» Тамара Канстанцінава і Мікалай Кундулеў.**

**Справа — на ўрачыстай лінейцы байцоў будаўнічых атрадаў. З пачаткам трэцяга, працоўнага семестра яго ўдзельнікаў віталі намеснік сакратара парткома ўніверсітэта Яўген Антонавіч Семянчук і сакратар камітэта камсамола Тамара Ільянкова.**

## ДОБРЫ СЛЕД

*пра тое, як прайшоў адзін працоўны дзень у будаўнічым атрадзе «Амфібія», наш расказ*

ШАСЕЙКА, як страла. Бачна на некалькі кіламетраў. Бліскучай пад сонцам істужкай пралегла яна праз бяскрайнія лясныя масівы.

Спачатку мы едзем па бруку. Потым пачаўся асфальт.

—Бліжэйшы шлях да Кіева, —зазначыў адзін з нашых спадарожнікаў. — Нейкіх тры-чатыры гадзіны язды — і там. Нараўлянцы часта бываюць на Украіне.

Слухаю словы, якія сведчаць аб добрым суседстве працаўнікоў рэспублік-сясцёр і любуюся непаўторнай прыгажосцю Нараўляншчыны. Хваёвыя бары, дубовыя і бярозавыя гаі перамяжоўваюцца з дробналессем. Месцамі да самай дарогі прыступаюцца балоты. Сям-там скрозь зараснікі прабіваюцца ледзь прыкметныя рачулкі.

Гэта і ёсць адзін з раёнаў беларускага Палесся — Усесаюзная камсамольская ўдарная будоўля. Рукамі маладых тут аднаўляецца зямля, ператвараецца ў кладоўку вялікага багацця. Людзі з дапамогай магутнай тэхнікі ўсё ў большых межах вядуць наступленне на балоты. Там, дзе яшчэ нядаўна была багна, ужо радуюць вока ўраджайныя нівы, новабудоўлі.

НЕ ПЕРШЫ год выязджаюць на меліярацыйныя трасы студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Найбольшых поспехаў дабіўся атрад «Амфібія». У яго працоўную біяграфію ўжо ўпісана пяць старонак. Самая яркая— мінулагодняя. Летась амфібіеўцы выйшлі пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве атрадаў, занятых на меліярацыі. Яны асвоілі 124 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. Гэта — самы высокі паказчык у рэспубліцы. За дасягнутыя поспехі атрад узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР, а камандзір Уладзімір Касабукін — Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.

Многа жадаючых працаваць у правафланговым атрадзе было і сёлета. Заслужылі гэтае права самыя дастойныя, надзейныя і старанныя студэнты і маладыя выкладчыкі факультэта фізічнага выхавання ўніверсітэта.

Атрад зноў узначаліў камсамолец Уладзімір Касабукін.

Дарэчы, атрад «Амфібія» — высокай спартыўнай кваліфікацыі. У яго саставе з 29 чалавек 7—майстры спорту СССР, Гэта — сам камандзір Уладзімір Касабукін, Аляксандр Кузьменка, Пётр Пракапчук, Віктар Кільчэўскі, Аляксандр Кугушаў, Мікалай Смалякоў, Міхаіл Дудкоў. Астатнія байцы атрада — спартсмены-разраднікі.

Атрад «Амфібія» сёлета дыслацыруецца ў вёсцы Міхайлаўка — адной з самых аддалёных у раёне. Рабяты вядуць работу на ўчастку «Дзёрнавічы» Нараўлянскай ПМК-20. І перш, чым азнаёміцца з іх працай і жыццём, я меў кароткую размову з начальнікам перасоўнай механізаванай калоны Б. І. Цімафеевым.

—Проста малайцы. Выдатна працуюць! — ацаніў працу байцоў атрада Барыс Іванавіч.

Словы сапраўднага задавальнення і вялікай удзячнасці ў адрас амфібіеўцаў выказваў і начальнік участка «Дзёрнавічы» Міхаіл Мікалаевіч Ануфрыенка, калі мы ехалі разам з Нароўлі ў Міхайлаўку.

— Ужо чацвёртае лета працуюць у нас студэнты. У папярэднія гады былі атрады з Мазырскага педінстытута. Таксама стараліся. Але з гамельчанамі — не параўнаць. Гэтыя вызначаюцца працаздольнасцю, армейскай дысцыплінаванасцю, уменнем павесяліцца ў мінуты адпачынку. Словам, хлопцы што трэба! Рады прымаць такіх кожны год.

Гэта гаварыў чалавек, пад чыім непасрэдным кіраўніцтвам працуе будаўнічы атрад. Шмат пахвальных слоў пра яго байцоў давялося пачуць таксама ад галоўнага інжынера ПМК-20, механізатараў, рабочых, звычайных людзей. І першым абавязкова называлі камандзіра Уладзіміра Касабукіна. Надта ж прыкметнай стала яго распарадчасць, арганізатарская здольнасць, вялікае ўмельства як спартсмена, музыканта, мастака.

Так і гаварылі:

— Во, гэта сапраўдны камандзір!

Перш за ўсё хацелася сустрэцца з самім Уладзімірам.

УЖО ПРЫ ПАД'ЕЗДЗЕ да вёскі Міхайлаўка бачны Дзяржаўны флаг Беларускай ССР, які высока развіваецца над цагляным будынкам. Тут — на сядзібе ўчастка «Дзёрнавічы»— размясціўся атрад. Аб гэтым напамінае не толькі флаг, але і чырвонае палотнішча са словамі «СБА «Амфібія» ГДУ», плакаты пра студэнцкія будаўнічыя атрады і іншая нагляднасць.

Байцы атрада пасяліліся ў клубе меліярацыйнага ўчастка. Заходжу туды. Ні душы. Усе заняты працай. У вочы кідаецца чысціня і парадак. Акуратна запраўлены ложкі. Нідзе нічога лішняга. На відным месцы — насценная газета, графік дзяжурства і распарадак дня. Як у армейскай казарме. І сапраўды, ужо адно гэта сведчыць аб высокай дысцыпліне ў атрадзе.

Заходжу ў перасоўны вагончык, што стаіць побач. На дзвярах надпісы: «Штаб будаўнічага атрада», «Медпункт». У пакоі штаба ажыўлена. Вакол чарнявага, сярэдняга росту сімпатычнага юнака ўюнамі круцяцца падлеткі. Як бачна, рыхтуецца штосьці цікавае.

— Ну, супакойцеся, — добразычліва сказаў гаспадар штаба і прадставіўся: — Камандзір атрада...

Пасля знаёмства Уладзімір Касабукін прапанаваў:

— Сёння заняткі спартыўнай секцыі піянерскага лагера «Спадарожнік», які мы арганізавалі пры сваім атрадзе. Калі жадаеце, пайшлі з намі.

І вось мы крочым па жытнёваму ржышчу. Хлапчукі з лагоднасцю і шчырасцю ні на крок не адступаюць ад камандзіра. Кожны стараецца крочыць з ім побач. Наперабой дзеляцца сваімі думкамі, прапановамі, прагнозамі. Так і раздаецца:

— Валодзя, Валодзька, паслухай...

А ён з рабятамі, як роўны з роўнымі.

Дзіцячай радасці няма канца. Проста люба глядзець на гэтых паслухмяных басаногіх, чарнявых і бялёсых, з рабацiннем на твары і блакітнымі, як неба, вачыма хлапчукоў. І зразумела такая вялікая іх прывязанасць да Уладзіміра Касабукіна. Яшчэ б! Іх кумір — майстар спорту СССР па біятлону. Па гэтаму віду ён трэніруе зборную каманду Гомельшчыны. Вінтоўкі прывёз з сабою. Рабяты ў надзейным месцы абсталявалі часовае стрэльбішча.

— На першых занятках, — расказвае Валодзя, — многія члены секцыі нават вінтоўкі ў руках трымаць не ўмелі. Што ні выстрал — міма. Цяпер зусім іншая справа. Самі пабачыце.

На агнявы рубеж пачаргоўна залягалі адна за другой пары юных стралкоў. Першыя пяць патронаў — пробныя, наступныя пяць — кантрольныя. Валодзя падказвае, у якой пазіцыі трэба весці стральбу, як лепш узяць прыцэл. Нельга было не пацешыцца, з якім захапленнем дзетвара вяла спаборніцтвы. Пасля іх сама больш радаваўся шасцікласнік Ваня Маргулец. На гэты раз ён стаў пераможцам. З пяцідзесяці магчымых выбіў 42 ачкі. Тры пулі леглі ў дзесятку.

Радасцю ззяў тварык і дзевяцігадовага Сашы Буйды. Ён таксама страляў нядрэнна, выбіў 26 ачкоў — больш за некаторых старэйшых сябрукоў.

Закончыліся стрэльбы, і малышы, абступіўшы камандзіра, у адзін голас загаварылі:

— Валодзя, а да заўтрага мы самі саб'ём шчыт з дошак. З планкамі. Такі, каб у зямлю ўкапаць.

Камандзір ухваліў ініцыятыву і распарадзіўся:

— А цяпер, братва, па дамах. Пара на абед.

Сам Валодзя паспяшаўся ў сталоўку, каб своечасова адправіць страву для байцоў атрада. Адны з іх нарыхтоўвалі дзярніну, другія — калкі і рыззё для абплёткі канала, трэція — працавалі на закладцы трубы, чацвёртыя — умацоўвалі адхоны цэнтральнага канала, які працягнуўся ўздоўж дарогі, што вядзе з вёскі Дзёрнавічы ў Міхайлаўку.

АБ'ЕКТ у амфібіеўцаў нялёгкі. Асабліва дастаецца на цэнтральным канале. Грунт тут, як называюць яго, — мылец-плывун. Хутка змываецца вадой. Пройдзе дождж, і на адхонах паяўляюцца раўчукі. Месцамі павымывала цэлыя канавы. Засыпаць бульдозерам — не прыступішся. Даводзіцца ўручную. І хлопцы працуюць рыдлёўкамі ў поце твару. Ад раніцы да позняга вечара.

Метр за метрам аплятаецца канал, умацоўваюцца і акаймляюцца дзярнінай адхоны. Гл.і дзіш і здаецца, што вада бяжыць па бясконцаму карыту.

Нялёгка і тым байцам, які працуюць на збудаванні труб. Гэтай работай у асноўным заняты камісар атрада Міхаіл Саўчанка, Віктар Грамыка і Васіль Башлакоў. Хлопцы працуюць таксама ад раніцы і да заходу сонца. Была ўжо пятая гадзіна. Не хапіла цэменту. Хутка паслалі аўтамашыну і даставілі яго. Закончылі работу прыцемкамі.

БЫЛО каля 9 гадзін вечара, калі мы зноў сустрэліся з камандзірам атрада Уладзімірам Касабукіным. Ён пабываў каля ўсіх брыгад будаўнічага атрада і вяртаўся, каб назаўтра дамовіцца з кіраўніцтвам участка наконт тэхнікі.

— Ну як справы? — спытаў яго начальнік участка Міхаіл Мікалаевіч Ануфрыенка.

— Добра. Бетон залілі, стойкі засмалілі. Назаўтра патрэбен пад'ёмны кран. Будзем перакрыццё класці, — растлумачыў Валодзя і на момант задумаўся. Потым дадаў:

— Без трактара таксама не абысціся. Рукамі пліты не падцягнем. Не па сіле.

— Тэхніку дадзім абавязкова, — запэўніў начальнік і спытаў:

— А як катлаван засыпаць мяркуеце? Бульдозерам можна толькі з аднаго боку.

— З двух зможам, Мікалаевіч. Я ўжо абдумаў, — і Валодзя падзяліўся сваімі планамі.

Рабяты вырашылі засыпаць катлаван спачатку з даступнага боку, потым пакласці прагоны і праз іх насоўваць грунт на супрацьлеглы бок.

— А што, разумна, — ухваліў прапанову Міхаіл Мікалаевіч. — Толькі асцярожнымі будзьце, не зрушце з месца апорныя блокі, — папярэдзіў ён.

— Не зрушым, — з упэўненасцю адказаў камандзір. — Паставім распоркі. Асцярожна будзем засыпаць.

Я слухаў гэтую размову і пераконваўся ў справядлівасці начальніка ўчастка М. М. Ануфрыенкі, калі ён гаварыў пра Валодзю, што гэта — думаючы, вынаходлівы камандзір. Касабукін не чакае ўказанняў, а кожную задачу імкнецца вырашыць сам. І заўсёды талкова. Яму толькі тэхніку давай. Таму мяне ўжо не здзіўляла, якім гэта чынам брыгада будаўнікоў узводзіла на канале трубу за 8 дзён, калі па норме патрабаваўся цэлы месяц.

Валодзя жартуе:

— Нашы хлопцы працуюць і адразу ж думаюць. А то навошта ў іх галовы? Глядзі, ды да нечага дадумаюцца. Прыкінем, прымяркуем — зручней, лягчэй.

Я папрасіў Валодзю назваць прозвішчы лепшых байцоў.

— Якія лепшыя? У нас ўсе старанна працуюць, — адказаў Валодзя. Калі хваліць, дык усіх... І толькі перад маім ад'ездам ён прасіў:

— Калі можна, успомніце Сашу Дыбко, брыгадзіра. Такіх хлопцаў пашукаць трэба. Амаль самы малады і самы непаседлівы. Закончыць брыгада адну работу — падказваць не трэба: другую знойдзе...

Я РАЗВІТВАЎСЯ з байцамі будаўнічага атрада «Амфібія» з пачуццём вялікага задавальнення. Радавалі не толькі іх працоўныя здабыткі. Студэнты дапамаглі мясцовым гаспадаркам у нарыхтоўцы кармоў для грамадскага статку, для Міхайлаўскай пачатковай школы адрамантавалі парты, перад насельніцтвам выступалі з лекцыямі і гутаркамі. Моладзі надоўга запамятаюцца сумесныя вечары адпачынку, канцэрты мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

